Б-172

Год выдання VI
№ 12 (127)
12
Чэрвеня
1941 года
Цана 10 к.

Гос. Публичная Библиотека в Ленинграде
С-120083

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За ленінскія кадры

ОРГАН партбюро, камітэта ЛКСМБ, прафкома, МК і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

На геаграфічным факультэце адбыўся ўжо тры дзяржаўных экзамены. Выдатныя адзнакі па трох прадметах атрымалі выпускнікі тт. **Зеленко, Волкаў, Каган, Шульман, Цыманава, Фурэ і Вольперт.**

На здымку: Пасяджанне дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі геафака. Здае экзамен выпускніца тав. **Бязручка.**

ЭКЗАМЕН ПА БЕЛМОВЕ

Экзаменацыйная сесія праходзіць на высокім узроўні, пад знакам праверкі работы прафесарска-выкладчыцкага састава і ведаў студэнтаў. Трэба сказаць, што пры праверцы выяўляецца у большасці студэнтаў глыбокая засваяемасць праграмнага матэрыялу, уменне практычна прымяняць яго ў штодзённым жыцці. Адначасова з праслухоўваннем лекцый студэнты прапрацоўвалі неабходную літаратуру і выконвалі хатнія заданні. Такая паступовасць у рабоце дала магчымасць добра засвоіваць матэрыял.

Па вядучаму мною прадмету, беларускай мове, студэнты 3 курса гістарычнага факультэта на экзамене ў большасці паказалі, што яны нядрэнна працавалі на працягу года. Да ліку такіх адносяцца тт. Глінскі, Фуксон, Віткоўская, Салтанаў, Дорскі, Грыгор'еў, Біндзюк і інш.

Але ёсць яшчэ і такія студэнты, якія лічаць, што быць пісьменным—справа не гісторыка. Іх адзінкі, але яны ёсць (Апацкая, Разенгауз, Балбуцкі). За ўвесь год яны не браліся нават за кнігу, лічачы, што на экзамене удасца неяк «праскочыць». Але цяжка ехаць на шчасці! Пры правядзенні кантрольнай дыктоўкі гэтыя студэнты выявілі поўную непісьменнасць. Так, напрыклад, т. Балбуцкі піша: «**Не рухомы, што хвіліна, кожды, савецкая**» і інш., т. Разенгауз: — «**ўрачыстае панарома, безданні, што хвіліна, у веках, неабсяжнамі, нерухомамі**»; знакі прыпынку для іх зусім не існуюць.

Студэнты 1 курса філфака (беларуская група) працавалі ў году някепска і таму маюць нядрэнныя вынікі, але ў будучым навучальным годзе прыдзецца з імі яшчэ многа папрацаваць.

Трэба адзначыць, што колькасць гадзін (80), адведзеная для праходжання курса беларускай мовы, зусім незначная. Навучальная частка, мабыць, лічыць, што студэнты універсітэта павінны быць толькі арфаграфічна пісьменнымі людзьмі. У новым навучальным годзе трэба адвесці больш гадзін для праходжання рускай і беларускай моў.

Патрэбна дабівацца таго, каб студэнты не толькі былі знаўцамі сваёй спецыяльнасці, а каб яны былі і зусім граматнымі.

В. М. ВЯРБІЛАЎ,
выкладчык беларускай мовы.

БОЛЬШ УВАГІ ФІЗКУЛЬТУРЫ

Ваенна-фізкультурнай падрыхтоўцы моладзі зараз прыдаецца выключна вялікая ўвага. Рэгулярнымі заняткамі фізкультурай і спортам юнакі і дзяўчаты павінны выхоўваць у сябе сілу, лоўкасць і вынослівасць—якасці, неабходныя маладому грамадзяніну нашай радзімы.

Фізкультура і спорт становяцца штодзённай неабходнасцю студэнтаў.

Праведзеныя ў гэтым годзе кафедрай фізкультуры і грамадскімі арганізацыямі універсітэта мерапрыемствы у многім спрыялі ўмацаванню масава-фізкультурнай работы. Пераважная большасць студэнтаў па-сапраўднаму ацаніла значэнне фізкультуры.

У лыжным кросе прыняло ўдзел 660 чалавек; 571 чалавек выступіла на спаборніцтвах комсамольцаў па гімнастыцы. У толькі што аб'яўленым комсамольска-профсаюзным кросе ўжо прыняло ўдзел каля 300 студэнтаў.

За прайшоўшы навучальны год многія студэнты дабіліся высокіх асабовых рэзультатаў (студэнт V курса фізмата Сідарэнка, студэнт III курса геафака Рудомін, студэнт IV курса гістфака Крышчановіч, сталінскі стыпендыят Шэфер і інш.).

Значна павысілася і паспяховасць па фізкультуры. Аб гэтым сведчаць праведзеныя залікі. У 1-й групе II курса хімфака—пераважная колькасць выдатных і добрых адзнак. Наведванне лекцый фізкультуры тут было заўсёды стопрацентным. Студэнты старанна выконвалі ўсе практыкаванні. Гэта адна з лепшых груп ва універсітэце.

Нядрэнна абстаіць справа з аўладаннем фізкультурай і на II курсе гістфака.

Аднак ёсць яшчэ рад студэнтаў, якія ўсімі мерамі і сродкамі імкнуцца ўвільнуць ад заняткаў па фізкультуры; яны лічаць чамусьці гэты прадмет другарадным. Нікчэмнай справай з'яўляюцца лекцыі па фізкультуры для студэнта 1 курса гістфака Разенгауза. На погляд студэнта II курса фізмата Пулькіна, існуючая сістэма фізкультурных заняткаў для яго не падыходзіць, моў, трэба прыдумаць штосьці другое, новае. Студэнтка гэтага курса Фрумкіна на працягу ўсяго навучальнага года толькі два разы прысутнічала на занятках.

Студэнтка Аксенкрут (II курс філфака) лекцыі наведвала ў якасці гледача, яна баялася падыйсці да турніка ці бруссяў. «Цяжка», «гэтага я на зраблю», «гэта практыкаванне рызыкоўнае»,—так разважала на працягу ўсяго года тав. Аксенкрут.

Пад выглядам «безнадзейна хворых» усяляк імкнуліся ўвільнуць і ўвільнялі ад фізкультуры Негіна, Рудніцкая, Голанд (хімфак), Азярыцкая, Будай (філфак) і інш.

Універсітэцкі ўрач т. Пазнанская часта безпадстаўна вызваляла ад заняткаў па фізкультуры некаторых студэнтаў. З 35 студэнтаў II курса філфака 13 маюць даведкі ад т. Пазнанскай. Сярод іх ёсць здаровыя таварышы, якія магліб упаўне наведваць лекцыі.

В. РАК,
загадчык кафедры фізкультуры.

ДА ЛЕТНІХ КАНІКУЛ

Цікава і весела правядуць свае канікулы ў гэтым годзе студэнты нашага універсітэта.

Рэктарыят, партыйнае бюро, прафком і камітэт комсамола намецілі рад каштоўных і карысных аздаравіцельных, культурна-масавых і абаронна-фізкультурных мерапрыемстваў на час летніх канікул.

50 выдатнікаў вучобы і лепшых грамадскіх работнікаў пасылаюцца ў двухтыднёвыя дамы адпачынку. На курорты і ў санаторыі Саюза паедзе 15 чалавек. Для дзяцей студэнтаў набыта 8 путёвак у піонерскія лагеры і дзіцячыя сады.

На працягу ліпеня і жніўня арганізуецца 3 экскурсіі: у Каўнас, Ленінград і Маскву.

Два разы студэнты праглядзяць пастаноўкі МХАТ'а.

У лекторыі універсітэта будзе прачытана некалькі лекцый. 11-га ліпеня праводзіцца вечар, прысвечаны 21-гадзіне вызвалення Беларусі ад белапалякаў.

На буйнейшыя прадпрыемствы горада Мінска комсамольскі камітэт і прафком арганізуюць дзве экскурсіі. 2 разы ў тыдзелю ў кіно-зале універсітэта будуць дэманстравацца кіно-карціны.

4-га ліпеня каманды універсітэта прымуць удзел у фізкультурна-спартыўных спаборніцтвах вышэйшых навучальных устаноў. У канцы ліпеня ў Мінску адбудзецца таварыская сустрэча нашых каманд з камандамі Харкаўскага Дзяржаўнага Універсітэта па лёгкай атлетыцы, валейболу, баскетболу і боксу.

На час канікул арганізуюцца секцыі: ручных гульняў, лёгка-атлетычная і плавання. Раз у нядзелю будуць праводзіцца заняткі па абароннаму комплексу (штыхавому бою, гранатамятанню, стральбе і інш.).

НЕДАХОПЫ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

(З ЭКЗАМЕНА НА ФІЛФАКУ)

6 і 7 чэрвеня на першым курсе філалагічнага факультэта праводзіўся экзамен па практычнай рускай мове. Вынікі дыктанта паказалі, што рад студэнтаў яшчэ недастаткова авалодалі граматнасцю, навыкамі пісьма. Галоўным чынам гэта адносіцца да беларускага аддзялення. Тут ні адзін таварыш з усёй групы не напісаў дыктанта на выдатна.

Значна лепш абстаіць справа на рускім аддзяленні, дзе пераважная большасць студэнтаў атрымала выдатныя і добрыя адзнакі.

Вусныя экзамены выявілі недахопы ў рабоце беларускага аддзялення. Некаторыя студэнты недасканала ведаюць граматычныя правілы, дрэнна валодаюць мовай размовы. Так, студэнт М. гаворыць: «Глагол неопределенного времени»; замест літары «ша» гаворыць «эш», замест «сэс» — «сэ» і т. д., ужывае беларускія формы (так, ён прывёў у якасці прыклада «вкусный яблок», а не «вкусное яблоко») і г. д. Тав. Жукава і Лістападава дрэнна ведаюць граматыку.

Выдатныя адзнакі па беларускім аддзяленні атрымалі толькі двое—тав. Астравік і тав. Гарабейнік. Іх адказы былі грунтоўнымі.

На рускім аддзяленні выдатна атрымалі тт. Радштэйн, Загорчык, Рэзнік, Серко, Ашбель. Названыя таварышы паказалі ўзор валодання мовай адказу, веданне граматычных правіл, выдатную арыентацыю пры граматычным разглядзе тэксту. Поспех іх непасрэдна вынікае з упартай і настойлівай працы на працягу ўсяго навучальнага года, з пастаяннай і крапатлівай работы над вучэбным матэрыялам.

Многаму садзейнічала выдатнае вядзенне прадмета тав. Гурскім — кваліфікаваным выкладчыкам і кансультантам.

Як на прабел у рабоце аботвух аддзяленняў, трэба ўказаць на недастатковую практычную арыентацыю ў формах дзеясловаў, у прыватнасці, у станах дзеясловаў.

Увогуле экзамен паказаў, што пераважная большасць студэнтаў мае грунтоўныя веды па рускай практычнай мове.

Р. САЗОНІК.

НА ЭКЗАМЕНЫ...

Некаторыя студэнты лічаць здаваць экзамен непадрыхтаванымі, ускладваючы ўсе надзеі на «авось».

Навошта мне лекцыі тыя,
Упартай вучобы час;
Шпаргалкі, канспекты чужыя —
Вось ведаў патрэбны запас.
На бойкасць і шпаркасць размовы
Надзеі свае ўскладу, —
З такой падрыхтоўкай чарговы
Экзамен здаваць я ду.

ДВАЦЦАЦІГАДОВАМУ ЮБІЛЕЮ УНІВЕРСІТЭТА—ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

★ ★★★ ★

У чэсць юбілею

Выкладчык асноў марксізма-ленінізма І. М. Валчок закончыў напісанне і днямі будзе абараняць дысертацыю на ступень кандыдата навук; тэма яго дысертацыі—«Крытыка геаграфічнага напрамку ў сацыялогіі».

***

Датэрмінова напісалі свае кандыдацкія работы аспіранты тт. Рымбург, Фрыдман, Раманаў і Клеўко.

***

Да юбілейных урачыстасцей факультэты універсітэта выпускаюць юбілейныя зборнікі. Філалагічны факультэт ужо выдаў 2 зборнікі. Знаходзяцца ў друку зборнікі хімічнага, фізіка-матэматычнага, біялагічнага і гістарычнага факультэтаў. Акрамя гэтага выходзіць атульна-універсітэцкі зборнік.

Ход падпіскі на пазыку

На 10 чэрвеня падпіскай на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года) ахоплена 349 выкладчыкаў, дапаможных і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў. Агульная сума падпіскі складае 145.955 руб. 165 таварышоў падпісаліся на месячны аклад.

На 25.170 руб. падпісаліся на пазыку 183 студэнты. Добра арганізавана падпіска на фізіка-матэматычным факультэце (старшыня профбюро тав. Харык, сакратар комсамольскага бюро т. Рубінштэйн).

ГЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

Геаграфічны факультэт к 20-ці гадоваму юбілею універсітэта рыхтуе дастойны падарунак — добра пераабсталяваны геолага-мінералагічны музей. Зараз у музеі ідзе інтэнсіўная работа.

Да гэтага часу пры геафаку існаваў мінералагічны музей, які меў у сваім распараджэнні вялікую колькасць відаў мінералаў, атрыманых у розны час, пачынаючы з 1924 года, не толькі з абласцей СССР (пераважна з Урала), але і з Англіі, Францыі і Германіі. Віды мінералаў большай часткай прадстаўляюць сабой выдатныя экземпляры, а некаторыя з іх, як горны хрусталь у розных відах, кварцы, малахіт, лабрадор і інш., зварачаюць асаблівую на сябе ўвагу.

Зараз музей ператворан у геолага мінералагічны. Пры ім арганізованы новыя аддзелы: петраграфіі, агульнай геалогіі, гістарычнай геалогіі і паленталогіі і беларускі. Усе калекцыі змяшчаюцца ў спецыяльна падрыхтаваных вітрынах замест былых вітрын-столікаў пераноснага тыпу.

Пачата мантыроўка ўсіх відаў мінералаў, выстаўленых у вітрынах, на спецыяльна зроблепыя, сваімі сродкамі, гіпсавыя пласцінкі. Ужо аформлена 17 вітрын.

Аддзел петратрафіі прадстаўлен выдатнымі відамі парод, у лік якіх уваходзяць віды, пераданыя пеінстытутам. У аддзеле гістарычнай геалогіі і паленталогіі маюцца таксама экспанаты, заслугоўваючыя ўвагі.

Беларускі аддзел адлюстроўвае сабою карысныя выкапні БССР: торф—у натуральным яго відзе, а таксама ў відзе брыкет, фасфарыты, сабраныя з розных месц БССР, кварцы розныя гліны і інш. Выстаўлены віды, паказваючыя, якім геалагічным працэсам падвяргалася тэрыторыя БССР у розныя геалагічныя перыяды; між іншым, тут прадстаўлены пароды дакембрыйскага, дэвонскага, юрскага, мелавога, трэцічнага і чацвярцічнага перыядаў.

Дзякуючы энергічнай рабоце загадчыка музея дацэнта Н. Е. Кавалёва, прысвячачага справе стварэння добрага музея ўвесь свой вопыт і веды, музей перабудоўваецца з такім разлікам, каб студэнты, праходзячыя крышталаграфію і мінералогію, маглі праводзіць практычныя заняткі ў музеі і папаўняць свае веды шляхам непасрэднага азнаямлення з самімі мінераламі.

ПІКУЛІК, старшы лабарант.

Выстаўка на фізмаце

Ажыццяўляючы пастанову XVIII з'езда ВКП(б) аб прывіцці навучаючымся сярэдняй школы працоўных павыкаў, кафедра фізікі сумесна з дэканам фізмата рашылі да 20-ці гадовага юбілею універсітэта арганізаваць выстаўку дэманстрацыйных і лабараторных установак, а таксама часткова і самаробных фізічных прылад па курсу фізікі ў 8—10 класах сярэдняй школы.

Рэктарыят падтрымаў нашу прапанову і аказаў дзейсную дапамогу ў правядзенні вялікай і складанай работы, звязанай з стварэннем выстаўкі.

Выстаўка адлюструе работу методыкі фізікі ў справе падрыхтоўкі педагагічных кадраў па курсу фізікі ў 8—10 класах сярэдняй школы, дасць магчымасць педагогам-фізікам гарадскіх і раённых школ на працягу двух месяцаў не толькі пазнаёміцца з фізічнай апаратурай, але і праводзіць дэманстрацыю і практычныя работы. Кафедра лічыць такое скарыстанне выстаўкі ў вышэйшай меры неабходным і мэтазгодным у сэнсе палепшання пастаноўкі выкладання фізікі.

Мяркуецца ператварыць гэту выстаўку пасля дабудавання аддзелаў 6—7 класаў у пастаянны музей, дзе педагогі-фізікі маглі б вывучаць тэхніку школьнага эксперымента ў поўным яго аб'ёме. Зразумела, што для гэтага патрабуецца пастаяннае памяшканне па-за універсітэтам.

Увесь прахадзімы, у апошніх трох класах сярэдніх школ, матэрыял па фізіцы на выстаўцы падзяляецца на 27 тэм. Кожная тэма складаецца з трох элементаў: дэманстрацыйныя установкі, лабараторныя установкі і самаробныя вучнёўскія прылады (часткова). **М. Я. ПЕЛЕП.**

ПЛАН ЮБІЛЕЙНАЙ НАВУКОВАЙ СЕСІІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Пленарнае пасяджэнне

(313 аўдыторыя біялагічнага корпуса)

Аўторак, 24 чэрвеня, у 19 гадзін.

1. Задачы навукі ў складанні і рэалізацыі 15-ці гадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР.
2. Дацэнт Ільюшын — «Ажыццяўленне Ленінска-Сталінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР».
3. Прафесар Ломцеў — «Паходжанне і развіццё беларускай мовы».

Пятніца, 27 чэрвеня, у 10 гадзін.

1. Акадэмік Т. Н. Годнеў — «Поспехі навукі ў вучэнні аб пабудове матэрыі ў зялёнай расліне».
2. Дацэнт З. Н. Дзянісаў — «Балоты БССР і іх гаспадарчае значэнне».
3. Дацэнт Зудзілін — «Соцыялістычнае будаўніцтва ў Заходніх абласцях БССР».
4. Дацэнт Дудкоў — «Сялянскі рух у Беларусі ў годы сталыпінскай рэформы».

БІЯЛАГІЧНАЯ СЕКЦЫЯ

Серада, 25 чэрвеня.

1. Прафесар М. Е. Макушок — «Рыбы БССР».
2. Дацэнт С. Ф. Марозаў—«Шчаўкуны БССР і іх лічынкі».
3. Асістэнт А. В. Вязовіч — «Біялогія белкі БССР».

Чацвер, 26 чэрвеня.

1. Прафесар Л. А. Зянкевіч — «Эвалюцыя рухальнай сістэмы ў жывёл».
2. Прафесар А. М. Вятохін — «Новае ў вучэнні аб артэрыяльным, перыферычным сэрцы».
3. Дацэнт Е. М. Зубковіч — «Забытыя адкрыцці Дарвіна». Пасяджэнні праходзяць у 212 аўдыторыі біялагічнага корпуса. Пачатак у 19 гадзін.

ГЕАГРАФІЧНАЯ СЕКЦЫЯ.

Серада, 25 чэрвеня.

1. Прафесар М. Н. Смірноў — «Месца Беларусі ў размяшчэнні народнай гаспадаркі Расіі ў XIX стагоддзі».
2. Кандыдат геаграфічных навук Слепян — «Гарады БССР».
3. Дацэнт Шкляр — «Феналагічныя нагляданні на тэрыторыі БССР».

Чацвер, 26 чэрвеня.

1. Дацэнт Н. Е. Кавалёў — «Геалагічная структура БССР».
2. Дацэнт В. А. Дзяменцеў — «Геаморфалагічны агляд Заходніх абласцей БССР».
3. Дацэнт Дудкін — «Максімальны і мінімальны сток у рэках усходніх абласцей БССР».

Пасяджэнні праходзяць у 36 аўдыторыі хімічнага корпуса. Пачатак ў 19 гадзін.

ФІЛАЛАГІЧНАЯ СЕКЦЫЯ

Серада, 25 чэрвеня.

1. Прафесар Петухоў, член-карэспандэнт Акадэміі Навук СССР — «Рускі падарожнік 30-х гадоў XIX стагоддзя. (Андрэй Нікалаевіч Карамзін)».
2. Дацэнт Грынблат — «Беларускі фальклор перыяда грамадзянскай вайны».
3. Дацэнт Шкляр — «Літоўскі статут, як памятнік беларускай мовы XVI стагоддзя».

Чацвер, 26, чэрвеня.

1. Дацэнт Гутараў — «Творчасць Янкі Купалы».
2. Прафесар Карнеева-Петрулан—«Мова Пушкіна».

Пасяджэнні праходзяць у 208 аўдыторыі біялагічнага корпуса. Пачатак у 19 гадзін.

ГІСТАРЫЧНАЯ СЕКЦЫЯ.

Серада, 25 чэрвеня.

1. Акадэмік В. П. Перцаў — «Рэвалюцыйныя элементы буржуазнай ідэалогіі ў Германіі ў XVIII стагоддзі».
2. Дацэнт І. С. Чымбург — «Плеханаў у годы сталыпінскай рэакцыі».
3. Старшы выкладчык Шабуня — «Аграрнае пытанне ў Беларусі напярэдадні рэволюцыі 1905—1907 гг.»

Чацвер, 26 чэрвеня.

1. Акадэмік М. Н. Нікольскі — «Прыватнае землеўладанне ў старажытным Двурэччы».
2. Дацэнт Шэўчанка — «Сялянская міфалогія эпохі крызісаў VIII — VII і V—IV ст. да н. э у старажытнай Грэцыі».
3. Дацэнт Ефімаў — «Да гісторыі сімонасекскага дагавора».

Пасяджэнні праходзяць у 313 аўдыторыі біялагічнага корпуса. Пачатак у 19 гадзін.

МАТЭМАТЫЧНАЯ СЕКЦЫЯ

Серада, 25 чэрвеня.

1. Прафесар Н. А. Сталяроў — «Аналітычны прызнак факальных восей крывых другога парадка».
2. Дацэнт Ламбін — «Аб адным класе істотна асобных точак аналітычнай функцыі».
3. Дацэнт Гельфанд — «Аб прыбліжаным інтэграванні дыферэнцыяльных ураўненняў у прыватных вытворных».
4. Дацэнт Нісневіч — «Праблема прадстаўлення груп матрыцамі».

Чацвер, 26 чэрвеня.

1. Дацэнт Сагаловіч—«Да пытання аб сувязі асноўных улясівасцей эліптычных інтэгралаў з уласцівасцямі эліпса і некаторых яго пераўтварэнняў».
2. Дацэнт Нахімоўская — «Да пытання аб умяшчэнні рыманавых прастораў у эўклідавым».
3. Дацэнт Шарамеццеў—«Тэарэма існавання плоскай задачы ў тэорыі пругкасці для абласцей з вуглавымі точкамі».
4. Аспірант Родаў—«Аб адной уласцівасці функцыі з абмежаванымі вытворнымі».

Пасяджэнні праходзяць у 2 аўдыторыі фізічнага корпуса. Пачатак у 19 гадзін.

ФІЗІЧНАЯ СЕКЦЫЯ

Серада, 25 чэрвеня.

1. Акадэмік Акулаў—«Аб фазавых і хімічных ператварэннях матэрыі» (сумесна з хімічнай секцыяй).
2. Дацэнт Фёдараў — «Прымяненне метада функцыяналаў да некаторых пытанняў тэорыі спрамянення».
3. Дацэнт Некрашэвіч—«Інверсія выпрамляючага дзеяння кантактаў».
4. Старшы выкладчык Габрыелаў—«Кінетыка ўтварэння вокісі медзі пры прыгатаванні купроксных элементаў».

Чацвер, 26 чэрвеня.

1. Дацэнт Шаніра — «Вызначэнне ліка мікракрышталікаў рэнтгенаўскім метадам».
2. Дацэнт Балабаеў—«Новыя ідэі ў тэорыі будовы атампага ядра».
3. Старшы выкладчык Эпштэйн—«Спектраграфічнае вывучэнне светавых кантрастаў».

Пасяджэнні праходзяць у 1 аўдыторыі фізічнага корпуса. Пачатак пасяджэння—25 чэрвеня ў 18 гадзін, 26 чэрвеня — у 19 гадзін.

ХІМІЧНАЯ СЕКЦЫЯ

Серада, 25 чэрвеня.

1. Акадэмік С. М. Ліпатаў—«Сучаснае вучэнне аб будове высокапалімерных злучэнняў».
2. Дацэнт Будкевіч—«Метады аналіза вады ў рыбалоўных вадаёмах БССР».
3. Дацэнт Баркан — «Аб роўнавазе сістэмы нітраты-бікарбанаты».

Чацвер, 26 чэрвеня

1. Дацэнт Паўлючэнка—«Тэорыя акісляльных працэсаў».
2. Дацэнт Бабраўніцкі—«Кандэнсацыя нітрофталевых ангідрыдаў з арматычнымі амінамі».
3. Асістэнт Малішэўская—«Атрыманне двувокісу цітана з сфенавага канцэнтрата».

Пасяджэнні праходзяць у 33 аўдыторыі хімічнага корпуса. Пачатак у 19 гадзін.

СЕКЦЫЯ ПЕДАГАГІЧНАЯ

Серада, 25 чэрвеня.

1. Дацэнт Шашкоў.—«Метады барацьбы за высокую паспяховасць у сярэдняй школе (вывучэнне і абагульненне вопыта перадавых настаўнікаў)».
2. Дацэнт Жылінскі—«Арганізацыя работы з геаграфічнай картай на ўроках геаграфіі ў сярэдняй школе».
3. Дацэнт Сагаловіч — «Актуальныя пытанні выкладання матэматыкі ў сярэдняй школе (да пытання аб практычных навыках на ўроках матэматыкі)».

Чацвер, 26 чэрвеня.

1. Дацэнт Марозаў — «Прышкольны ўчастак, як база назіранняў і доследаў па заалогіі ў школе».
2. Дацэнт Шэўчанка—«Пазашкольная работа па гісторыі ў 5—6 класах сярэдняй школы».
3. Дацэнт Турчанка — «Дыдактычныя погляды Памялоўскага».

ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ, ПРЫСВЕЧАНАЕ НАВУКОВЫМ ДАКЛАДАМ СТУДЭНТАЎ

Пятніца, 27 чэрвеня.

(вячэрняе пасяджэнне)

1. Студэнт Дукор (фізмат)—«Аб некаторых роўнамерна-поўных кольцах функцыі з непрарыўнымі вытворнымі».

Студэнт Абецэдарскі (гістфак)—«Вызваленчая барацьба беларускага народа супроць польскіх панаў у 1648—49 г.г.»

2. Студэнт Маеўскі (біяфак) — «Некаторыя новыя даныя аб фаўне сляпнёў у БССР».
4. Студэнт Рубінштэйн (фізмат)—«Некаторыя асаблівасці дэгектараў».

Мінск, друкарня «Звязды». УК 933 Тыраж 500 экз. Адказны рэдактар І. МАЛЮКЕВІЧ.